# ДЗЕЙНАСЦЬ І АСНОЎНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ МСЦІСЛАЎСКАГА РАЁННАГА ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНАГА МУЗЕЯ І ЯГО ФІЛІЯЛА

**А. А. Трусаў,** *канд. гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Старажытны горад Мсціслаў мае стогадовую музейную традыцыю. У 1915 г. з нагоды 100-годдзя мясцовага духоўнага вучылішча ў ім быў створаны царкоўна-археалагічны музей. У 1923 г. яго фонды мелі 1157 адзінак захоўвання. У музеі існавала 5 аддзелаў: археалагічны, нумізматычны, этнаграфічны, царкоўных старажытнасцей і аддзел, прысвечаны стогадовай гісторыі вучылішча. Пазней, у 1924 г., узніклі аддзелы: прыродна-гістарычны, мастацка-прамысловы і бібліяграфічны. Сярод унікальных экспанатаў даследчыкі адзначалі косткі мамантa, знойдзеныя ў кар'еры мсціслаўскай цагельні, каменныя сякеры, манеты розных часоў, старадрукі і рукапісныя царкоўныя кнігі, узоры народнага аддзення і інш. Экспанатаў было больш за 1100. Музей меў свой статут, пры ім дзейнічалі гурткі краязнаўцаў і аховы гістарычных помнікаў. Знаходзіліся музейныя экспазіцыі ў актавай зале педтэхнікума.

Аднак у перыяд з 1936 па 1938 г. краязнаўчы музей у Мсціславе быў закрыты, разам з адпаведнымі музеямі ў Слуцку, Мазыры, Нароўлі, Чэрвені і іншых гарадах. Лёс іх калекцый невядомы, аднак ёсць інфармацыя, што калекцыі мсціслаўскага музея зніклі канчаткова ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля вайны краязнаўства на Мсціслаўшчыне адрадзілася дзякуючы мясцовым настаўнікам. Адзін з іх, П. Д. Урублеўскі, які з 1951 г. працаваў выхавацелем ў Мсціслаўскай школе глухіх дзяцей, якая знаходзілася ў будынках былога езуіцкага калегіума XVIII ст., паставіў пытанне аб стварэнні школьнага краязнаўчага музея. Неўзабаве ён пачаў дзейнічаць. Выкладчыкі і дзеці, пачынаючы з 1959 г., працавалі на археалагічных раскопках пад кіраўніцтвам археолага з Масквы Леаніда Васільевіча Аляксеева на тэрыторыі Мсціслаўскага замчышча. У знак удзячнасці археолаг перадаваў некаторыя знаходкі ў школьны музей. Кожны год экспазіцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

папаўнялася за кошт этнаграфічных, нумізматычных і іншых экспанатаў.
У 1967 г. музей атрымаў званне народнага. У 1970 г. ён быў прадстаўлены ў Маскве на ВДНГ на выставе школьных музеяў СССР і атрымаў пяць медалёў. Яго кіраўнік, заслужаны настаўнік БССР П. Д. Урублеўскі, з'яўляўся грамадскім інспектарам па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Аднак пасля яго смерці музей паступова занепаў, і зараз яго ацалелыя экспанаты перавезены ў новае памяшканне, дзе музей дырэкцыя школы абяцае аднавіць.

Шмат гадоў мсціслаўская інтэлегенцыя змагалася за тое, каб у горадзе адкрыць і дзяржаўны музей. Пасля працяглых намаганняў грамадскасці ў 1988 г. быў створаны Мсціслаўскі раённы гісторыка-археалагічны музей. Спачатку ён размяшчаўся ў прыбудове да былога кармяліцкага касцёла. Узначаліў яго малады магілёўскі гісторык Сяргей Клімаў, зараз дырэктар Нясвіжскага музея-запаведніка «Нясвіж». Клімаў здолеў аб'яднаць вакол сябе мясцовых школьнікаў, якія дапамагалі папаўняць музейныя фонды цікавымі знаходкамі. Частку археалагічных знаходак, знойдзеных падчас раскопак гістарычнага цэнтра Мсціслава і Тупічэўскага манастыра, перадаў у музей і аўтар гэтага артыкула.

З 1994 па 2006 г. музеем кіраваў былы настаўнік гісторыі, таксама краязнавец У. Л. Гасянкоў. Ён разам з другім мсціслаўцам, А. А. Ясінскім, напісалі гісторыка-эканамічны нарыс пра Мсціслаў, які выйшаў у выдавецтве «Беларусь» у 1975 г. Шмат артыкулаў прысвяціў сваёй роднай Мсціслаўшчыне доктар гістарычных навук прафесар М.А.Ткачоў.

У маі 1995 г. музей пераехаў на сталае месца ў будынак былой павятовай пошты канца XIX ст. У 2008 г. у фондах музея налічвалася больш за 12 тысяч экспанатаў асноўнага фонду і 18 тысяч навукова-дапаможнага. Агульная плошча экспазіцыі склала 265 кв. м. Гэта дзве экспазіцыйныя залы (251,5 кв. м) і адна выставачная (37,6 кв. м).

У археалагічнай экспазіцыі «Мсціслаў – імя старажытнае» змяшчаюцца археалагічныя знаходкі з раскопак Мсціслаўскага замчышча, пасада і акольнага горада.

У экспазіцыі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Мсціслава ў XII–XX стст.» прадстаўлены калекцыі кафлі XVI–XVIII стст., шкла, посуду, прадметы быту, старая мэбля XIX–XX стст., манеты XIV–XX стст., кавальскія вырабы. Увагу наведвальнікаў музея

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыцягвае калекцыя «Жывапіс», а таксама музейны куток «Этнаграфія і быт», дзе галоўнае месца займае ткацкі станок.

У 2009 г. з’явіліся новыя элементы новай экспазіцыі «Куток Пятра Мсціслаўца», «Швейная майстэрня».

У 2011 г. у ліпені падчас «Рыцарскага фэсту. Мсціслаў – 2011» за межамі музея праводзілася выстава «Новыя старонкі сівой даўніны», якую наведалі каля 2 тысяч чалавек.

Падчас свята «Дзень горада», якое адбылося 23–24 верасня 2011 г., былі адкрыты новыя музейныя экспазіцыі «Знакамітыя землякі» і «Яўрэі ў гісторыі Мсціслава». У гэтыя дні па-за межамі музея працавала выстава «Архітэктура Беларусі».

Вялікую ролю музей мае ў арганізацыі розных культурных падзей у рэгіёне. Так, у 2001 г. у Мсціславе адбыўся Міжнародны пленэр па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве». Творы ўдзельнікаў пленэра папоўнілі музейную калекцыю.

У 2011 г. у горадзе прайшоў чарговы міжнародны пленэр мастакоў. З яго нагоды ў музеі была адкрыта мемарыяльная шыльда ў гонар Андрыяна Прахава, знакамітага гісторыка мастацтва, археалогіі і мастацкага крытыка, які паходзіць з Мсціслава (гады жыцця 1846–1916).

Музычная школа імя кампазітара М. Чуркіна (ён пэўны час жыў у Мсціславе) рэгулярна ладзіць розныя музычныя імпрэзы. Супрацоўнікі музея бралі актыўны ўдзел у правядзенні рэспубліканскага фестывалю камернай музыкі імя М. Чуркіна.

У горадзе рэгулярна праводзяцца рыцарскія фэсты і фестывалі. Актыўна адзначылі жыхары горада і шматлікія госці 600-я ўгодкі перамогі войскаў ВКЛ і Польшчы над крыжакамі на Грунвальдскім полі. Рыцарскі фэст адбыўся на пляцоўцы славутай Замкавай гары – месца, дзе і з’явіўся старажытны горад.

Фэст сярэднявечнай культуры нарадзіўся ў Мсціславе пяць гадоў таму, калі старшыня райвыканкама запрасіў клуб ваеннагістарычнай рэканструкцыі «Магілёўская дружына» паўдзельнічаць у Дні горада. 12 чалавек, сяброў клуба, бралі ўдзел у гэтым свяце. Так адбылося першае на ўсходзе Беларусі свята з удзелам рыцараў. Поспех у гараджан быў незвычайны. З тых часоў «Мсціслаўскі фэст» стаў брэндам. Крамы горада турысты бяруць прыступам, дзверы музея не зачыняюцца, майстры народных промыслаў за 2–3 дні збываюць усе свае вырабы.

«Рыцарскі фэст – 2010» прайшоў 24–25 ліпеня з асаблівым размахам. Месцамі правядзення сталі гарадскі цэнтр Мсціслава,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старыя муры езуіцкага калегіума і кляштара і, вядома, – Замкавая гара. Акрамя рыцарскіх забаў, у праграму былі ўключаны канцэрты гуртоў «Стары Ольса», «Яварына», «Песняры». На Замкавай гары быў урачыста адкрыты памятны знак мсціслаўскаму князю Сямёну Лунгвену, намесніку Вітаўта ў Грунвальдскай бітве. 15 ліпеня на Мсціслаўскім паштамце было зроблена спецгашэнне адмысловай маркі «600-годдзе перамогі пад Грунвальдам», прысвечанай памяці Сямёна Лунгвена.

Мсціслаўская зямля багатая на гістарычныя помнікі. І гэта не выпадкова. Ужо ў XII ст. Мсціслаў становіцца цэнтрам удзельнага княства спачатку ў складзе Вялікага Княства Смаленскага, а з XIV па XVI ст. – у складзе Вялікага Княства Літоўскага. З XVII – па XVIII ст. (да 1772 г.) Мсціслаў – ваяводскі горад у складзе Рэчы Паспалітай.

На тэрыторыі Мсціслаўшчыны захаваліся помнікі беларускага дойлідства і прыроды. Тут шмат унікальных крыніц з празрыстай, смачнай і лячэбнай вадой. Прыхільнікі «экалагічнага» турызму могуць наведаць помнік прыроды «Дуброва», дзе знаходзіцца Белкаўская крыніца з абсталяванай зонай адпачынку.

Унікальнымі помнікамі гісторыі і прыроды з’яўляюцца Кагальны калодзеж у самім горадзе, крыніца Здаровец і славутая крыніца ў Пустынскім манастыры.

Знакамітыя аб’екты турызму – Замкавая і Дзявочая горы, рэшткі Тупічэўскага Свята-Духавага манастыра, манастыры ў вёсках Ануфрыева і Мазалава.

У цэнтры горада знаходзіцца комплекс былога езуіцкага кляштара XVIII ст. з будынкамі калегіума, касцёла і аптэкі, былы Кармеліцкі касцёл XVII–XVIII стст. з унікальнымі фрэскамі, Троіцкая царква XIX ст., Слабацкая царква XIX ст. у цэнтры былой Казіміраўскай слабады, на месцы драўлянага ўніяцкага храма, царква Аляксандра Неўскага (другая палова XIX ст.), збудаваная на падмурках бернардынскага кляштара, драўляная царква XIX ст. на старажытных мсціслаўскіх могілках і шмат помнікаў грамадзянскай архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст. Сярод іх комплекс гандлёвых радоў, будынак былой сінагогі XIX ст, а таксама пажарная вежа, з якой бачна званіца Пустынскага манастыра, самая высокая ў Беларусі.

Вабіць турыстаў і славуты Пустынскі манастыр на мяжы з Расіяй, які наведваюць сотні паломнікаў з розных краін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музейнымі супрацоўнікамі распрацаваны наступныя турыстычныя маршруты: «Пустынскі Успенскі мужскі манастыр», «Архітэктурныя помнікі Мсціслава», «Мой родны кут – мой горад Мсціслаў», «Помнікі археалогіі: Дзявочая і Замкавая горы».

Дзякуючы турызму колькасць наведвальнікаў музея значна павялічылася. Калі ў 2006 г. музей і горад наведалі 5004 чалавекі, то ў 2010 г. – 14 315, з іх 11 366 – турысты-экскурсанты.

Цікавыя літаратурныя імпрэзы адбываюцца з нагоды юбілеяў пісьменнікаў, лёс якіх цесна звязаны з Мсціслаўшчынай. Гэта Максім Гарэцкі – класік беларускай літаратуры, Аркадзь Куляшоў, Эрнест Ялугін і інш.

Трэба сказаць, што ў Мсціслаўскім раёне існуе яшчэ адзін дзяржаўны музей. Гэта Літаратурны музей М.Гарэцкага у в.Малая Багацькаўка – малой радзіме класіка беларускай літаратуры. Ідэю стварыць такі музей да стагоддзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ўпершыню выказаў Уладзімір Караткевіч, маці якога паходзіць з Мсціслава. На месцы былога падворка сям'і Гарэцкіх была адноўлена хата Гарэцкіх (якая згарэла) паводле старых фотаздымкаў, зроблена адпаведная экспазіцыя, і 15 студзеня 1993 г. музей быў адкрыты як філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, які знаходзіцца ў Мінску. Апошні раз экспазіцыя музея, асабліва яе літаратурная частка, адноўлена ў 2008 г.

28 снежня 2010 г. музей М. Гарэцкага перададзены Мсціслаўскаму раённаму аддзелу культуры і стаў філіялам Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея.

Супрацоўнікі музея папулярызуюць беларускую мову сярод насельніцтва і гасцей горада і раёна, беручы прыклад са свайго знакамітага пісьменніка-земляка. Так, толькі ў першай палове 2011 г. праводзіліся экскурсіі на беларускай мове, па-беларуску афармляліся выставы з мэтай папулярызацыі вытокаў народнай творчасці, традыцыйнага мастацтва і гісторыка-культурнай спадчыны.

Таксама былі праведзены музейныя заняткі па тэмах: «Прыехалі Каляды на белым кані», «Шануй сваю мову», «Гучы родная мова».

Паводле даных на 01.10.2011 г., за 9 месяцаў было праведзена 175 экскурсій (12 186 наведвальнікаў музея), а колькасць платных паслуг дасягнула 13 418 500 руб. Такім чынам, назіраецца дынаміка росту цікаўнасці наведвальнікаў да культурна-гістарычнай і прыроднай спадчыны Мсціслаўшчыны, у яе асобе – усёй нашай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бацькаўшчыны. Гэта станоўча характарызуе музей у галіне турыстычнай дзейнасці.

1. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2002. – 176 с.

2. *Музеі* Беларусі. – Мінск: БелЭн, 2008. – 559 с.

3. *Нялюбін, А.* Зорны час для рыцара / Андрэй Нялюбін // Наша слова. – № 35. – 1 верасня 2010.

4. *Ткачоў, М. А.* Старажытны Мсціслаў / М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.

5. *Трусаў, А.А.* Знакаміты беларускі ваяр / А. А. Трусаў // Наша слова. – № 21. – 26 траўня 2010 г.

6. *Трусаў, А.А.* Роля гісторыка-культурнай спадчыны ў фарміраванні беларускай ментальнасці / А. А. Трусаў // Наша слова. – № 40. – 5 кастрычніка 2011 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ